літаратуры прыводзіць да дэкананізацыі традыцыйных жанраў, пазбаўляе іх першаснай актуальнасці і выклікае істотныя, не заўсёды станоўчыя змены ў культуры мовы і эстэтычным мысленні творчай асобы.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мінск : Навука і тэхніка, 1980.
2. Suchanek L. Thanatos i eschatologia. Z obserwacij nad poezą baroku rosyjskiego. Wyd-wo Polskiej akademii nauk : Rocznik komisji Historyczno-literackiej, 1974. T. XII. C. 3–21.
3. Русская силлабическая поэзия XVII–XVIII вв. Л. : Советский писатель, 1970.
4. Горфункель А. Х. Андрей Белобоцкий – поэт и философ конца XVII – начала XVIII в. // Труды Отдела древнерусской литературы. М.-Л. : Изд-во АН СССР, 1962. Т. 18. С. 188–213.
5. Подокшин С. А. Вольнодумец из Белоруссии Ян Белобоцкий (из истории идейных связей Белоруссии и России вт.п. XVII века) // Молодые ученые и современная философская наука. Минск : Изд-во АН БССР, 1964. С. 103–112.
6. Библиотека Якова Кротова [Электронный ресурс] Режим доступа : http://yakov.works/history/17/1680/belobozky.htm#33. Дата доступа : 02.03.2019.
7. Подокшин С. А. К вопросу о взаимодействии радикального направления реформации в Белоруссии и Литве с еретическим движением во вт. п. XVI в. // Материалы конференции молодых ученых Академии наук БССР. Минск, 1962.
8. Родчанка Р. В. Слуцкая старасвеччына. Мінск : Полымя, 1991.
9. Горфункель А. Х. «Пентатеугум» Андрея Белобоцкого (Из истории польско-русских литературных связей)». Труды Отдела древнерусской литературы. М.-Л. : Наука, 1965. Т. 21. С. 39–64.
10. Suchanek L. Rosyjski poemat eschatologiczny epoki baroku. Warszawa : Slawia Orientalis, 1975. nr 1. C. 39–44.

«МІНСКІ ТЭКСТ» ЯК ФЕНОМЕН СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

А. А. Карповіч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;
karpovich.arina@gmail.com;
навук. кіраўн. – С. В. Зелянко, канд. філал. навук, дацэнт

Аналіз сучасных беларускіх твораў мастацкай літаратуры, што адлюстроўваюць вобраз горада, сведчыць аб тым, што «Мінскі тэкст» як прастора сімвалаў і знакаў, праз якія адбываецца трансляцыя і інтэрпрэтацыя культурных сэнсаў, існуе і перманентна развіваецца. У кожную гістарычную эпоху, у кожнага аўтара ён свой, непаўторны, асабісты. На сучасным этапе ў літаратурнай

творчасці Беларусі горад знаходзіць сваё годнае адлюстраванне, а «Мінскі тэкст» напаўняецца ўсё новым зместам і ўзбагачаецца новымі якаснымі характарыстыкамі.

Ключавыя словы: «Мінскі тэкст»; гарадская прастора; вобраз горада; культурны феномен; інтэрпрэтацыя тэксту; беларуская літаратура.

Гарадская культура – складаная, шматаспектная з'ява, якая спараджаецца прасторай горада. У даследаванні зроблена спроба разгледзіць тэксты пра горад у якасці культурнага (у прыватнасці, літаратурнага) феномена.

Адным з першых расійскіх даследчыкаў гарадской прасторы называюць пецярбургскага краязнаўца М. П. Анцыферава. Архітэктурную прастору ён уяўляў як аснову, што стварае грамадскую арганізацыю, а таксама як адбітак сацыяльных і гістарычных з'яў. Даследчык адзначаў, што кожны горад мае ўласную «анатомію, фізіялогію і псіхалогію» [1, с. 17–29]. Пад «псіхалогіяй» або «душой» разумеецца гарадскі пейзаж, гістарычныя лёсы, грамадская памяць, характар насельніцтва і адлюстраванне мастацкіх густаў. Лінгвіст У. М. Топараў аднёс некаторыя творы рускай літаратуры да так званых «Пецярбургскіх тэкстаў» [2, с. 7]. Пад гэтым тэрмінам разумеецца наяўнасць пэўных рыс у творы, напрыклад, «адмоўнае» стаўленне да горада, звышнасычаная рэчаіснасць, параўнанне Пецярбурга і Масквы і г. д. Паняцце «Маскоўскі тэкст» характарызуецца як адзінства марфапаэтычных, тапаграфічных і тапанімічных знакава-сімвальных складнікаў [3].

Мэтай даследавання было высветліць, ці могуць некаторыя сучасныя творы, у якіх увасабляецца вобраз горада Мінска, з'яўляцца тэкстамі культуры, якія ўтвараюць «Мінскі тэкст». «Мінскі тэкст» разглядаецца беларускімі даследчыкамі як прастора сімвалаў і знакаў, праз чытанне якіх адбываецца трансляцыя і інтэрпрэтацыя культурных сэнсаў [4].

Для даследавання былі ўзяты наступныя літаратурныя творы: «Шабаны» Альгерда Бахарэвіча, «Казкі сталічныя» Адама Глобуса; цыкл вершаў «Мінскія/Менскія санэты» Сержа Мінскевіча і вершы «Город» і «Городской ветер» Адама Глобуса.

Аналіз мастацкіх твораў з пазіцыі моўнай формы паказаў, што літаратурныя формы прадстаўлены даволі шырока: раман («Шабаны»), казкі («Казкі сталічныя»), апавяданні, паэтычныя творы. У паданалізных творах прысутнічае філасофскае і метафізічнае асэнсаванне горада, узнімаюцца агульначалавечыя праблемы быцця. Кожны з твораў змяшчае асаблівы, непаўторны вобраз горада.

Параўнальны аналіз характэрных рыс «Пецярбургскага», «Маскоўскага» і «Мінскага» тэкстаў сведчыць аб наяўнасці адметных асаблівасцяў, уласцівых кожнаму з іх. Прычына гэтага – гістарычныя, этнаграфічныя, нацыянальна-культурныя перадумовы. Так, напрыклад, адной з рыс «Пецяр-

бургскага тэксту» з'яўляецца ўвасабленне горада не проста як прасторы, а як міфа, своеасаблівага люстэрка, праз якое Расія спрабуе сябе зразумець [2]. У той жа час так гістарычна склалася, што пераважнай часткай беларускага насельніцтва былі сяляне, якія не жылі гарадскім жыццём. Адлюстраваннем беларускага побыту і складу мыслення былі вёска, сялянскае жыццё. Менавіта гэта знайшло дастаткова поўнае адлюстраванне ў літаратурнай творчасці большасці нацыянальных пісьменнікаў і паэтаў. На сучасным этапе развіцця незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь, калі актывізаваўся рост гарадоў, узрастае цікавасць гісторыкаў, літаратараў да вобраза горада. Праблема фарміравання «Мінскага тэксту» як культурнай з'явы набывае ўсё большую актуальнасць.

Такім чынам, вынікі даследавання паказалі, што «Мінскі тэкст» існуе і развіваецца, паколькі ўзмацняецца інтарэс да гісторыі нашай краіны, яе гарадоў, якія растуць ва ўмовах урбанізацыі, іх жыццяпісу, а горад Мінск – гэта не толькі тэрытарыяльная прастора, але і культурнае асяроддзе, якое вырошчвае будучых пісьменнікаў і паэтаў, грамадзян дзяржавы. Можна быць упэўненым у тым, што ў літаратурнай творчасці Беларусі горад як культурны феномен знойдзе годнае адлюстраванне, а «Мінскі тэкст» будзе напаўняцца новым зместам і ўзбагачацца іншымі якаснымі характарыстыкамі.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Анциферов Н. П. Проблемы урбанизма в русской художественной литературе. М : ИМЛИ РАН, 2009.
2. Топоров В. Н. Петербургский текст русской литературы. СПб : Искусство-СПб, 2003.
3. Селеменева М. В. «Московский текст» в русской литературе XX в. // Вестник РУДН, сер. «Литературоведение. Журналистика», 2009. № 2. С. 20–27.
4. Соколова О. М. Минский текст: проблемы культурной памяти столичного города в условиях цивилизационного помежья. Минск : БГУКИ, 2017.

СОВРЕМЕННЫЙ НАУЧНО-ПОПУЛЯРНЫЙ ИСТОРИЧЕСКИЙ ЖУРНАЛ: СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ (на примере «Дилетанта» и «Нашай гісторыі»)

Д. С. Кашеро

Белорусский государственный университет, г. Минск;
kashero.den@mail.ru;
науч. рук. – Н. В. Саянова, ст. преподаватель

Целью данного исследования является выявление тенденций функционирования современного научно-популярного исторического журнала на примере